Ба216568

Отд. VII
27407

А. Дзяркач

# Бог у 2 ох



БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА 1930

Ба 216568

БІБЛІОТЭКА БЯЗБОЖНІКА

А. ДЗЯРКАЧ

# БОГ УДВОХ

СУЧАСНАЯ САТЫРА

VII

27407

Бел. аддзел 1934 г.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

1949
ПРОВЕРЕНО

ДЕРЖАВНА ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА
29.ІЮН.30
ОДЕСА

Заказ № 543. 5.000 экз. (2 арк.). Галоўлітбел № 1677.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

10. 2. 2010

## АД АЎТАРА

Каб унікнуць мажлівых непаразуменьняў, якія ў чытача могуць выклікаць паасобныя месцы поэмы „Бог удвох", лічу патрэбным дадаць, што поэма ставіць сваёй мэтаю—у старой баечнай форме даць новую антырэлігійную і палітычную сатыру.

„Бог і Пётра", якія дзейнічаюць у Польшчы, а пасьля ўцякаюць за савецкую мяжу,—гэта ня богі (бо іх няма і ніколі на сьвеце ня было), а двое звычайных сялян. Яны толькі выдаюць сябе за багоў, каб паглядзець на справе, што з гэтага выйдзе—ці вераць у бога самі паны, ці толькі хлусяць народу.

З гэтым дадаткам усё далейшае ў поэме не павінна выклікаць ніякага зьдзіўленьня або пытаньняў. А рэшта—гэта ўжо справа нашых крытыкаў.

*А. Д.*

# ПРАДМОВА

Быў я сёлета у хаце
Ў дзядзькі нашага Стафана—
І сьмяяўся, родны браце,
Аж да вечара ад рана,
    Бо як вытне Стэфка казкі
    Усьмяшліва загаворыць,
    Лопне бруха без завязкі—
    Чуць да сьмерці не заморыць!
Дзе й бярэцца у старога?
Але, праўда, жыў нямала
І ня дзіва—бачыў многа;
Ад яго-ж і мне папала!
    А усім ужо вядома,
    Што я песьні ня трымаю
    Так, як жонку тую дома,
    І хутчэй у сьвет пускаю...
Так і тут... Прашу—сядайце,
Хто на зэдлі, хто на лаве.
І па поўніцы глытайце
Праўду ў казачнай аправе...

# *Ч а с т к а  п е р ш а я*

## У РАІ

Ўсякі знае, што на небе,
Калі толькі поп ня хлусіць
Па якой-нібудзь патрэбе—
Бог сядзець павінен, мусіць...

Гэтак сама—ня іначай—
Там і Пётра адраканец...
Часам плача, часам скача,
Або зьнізвае ружанец...

## У КАРЧМЕ

Неяк вечарам, па працы
Бог зайшоў на пару піва
У Абрамавы палацы—
Ў гэтым я ня бачу дзіва:

Хто з папоў сюды ня глазіць?
А яны і бог—дзьве кроплі... І
Ўсьлед за богам Пётра ўлазіць,
Як Пілiп з тае каноплі...

Слова за слава—размова...
І Абрам тры грошы ззаду:

Перш пра соль, пасьля пра дровы,
А ў канцы—зусім бяз ладу...
Як другі,—а я дзівіцца
Ня прывык яшчэ ніколі...
Што за дзіва, што муціцца
Ў галаве ад дроў і солі?

Праўда, дроў яны ня елі,
Піва—трошачкі салілі...
Але—бачыце—запелі,
Як дзьве бочкі працадзілі!

## ШКАНДАЛ

У карчме стаяў гармідар:
Напавер Абрам—ні пляшкі...
„Я-ж твой бог!“—„Няхай хоць Сідар!“—
Піва я бяру ня з ражкі!
Мне ня верацъ вось настолькі!
Ў піваварні вылаж грошы—
Ўсё палічаць, што і колькі...
Вось які твой рай харошы!“

— „А, ты гэтак?“—бог за грудзі,
Як схапіў з Пятром Абрама,
Дык забіў-бы, каб ня людзі
І ня куксы тога Хама,
Бо і ён таксама лакаў...
Там на небе, ўсе п‘янюгі,
Ашуканцы, як той Якаў,
І, як той Давід, латругі!

## ХАМСКАЯ РАСПРАВА

Хам як выскачыў з мярлогі
Плескануў тры разы ў ладкі—
Бог з Пятром пад пахі ногі
І ўцякаць ва ўсе лапаткі...
    Але дзе ты гэта бачыў?
    Пераняў іх Хам ў хвіліну
    І абоім налабачыў,
    Колькі ўлезе ў нос і сьпіну!
Хоць і варт было, а шкода—
Біць старога пад мікіткі,—
Я ня знаю, што за мода?
Па-маему, спосаб брыдкі!
    Ўзяў-бы гэтак, як малога:
    Разлажыў—у гору плечы—
    І наляскаў, хоць і многа,
    Але што-ж?—па-чалавечы!
Далей слова к слову ніжам—
Памагаць ня ў нашай ласцы...
Бог стаяў, як чорт пад крыжам,
Пётра дрыгаўся ад трасцы...

## З НЕБА НА ЗЯМЛЮ

Хам бязьлітасны ні вокам...
„Кінь лакуту—больш ня трэба!“
Не! вядзе іх крок за крокам
Праз варота на край неба...
    Ен паставіў іх сьпіною
    Да сябе... А сам у пору

Як загрэе ў зад нагою,—
Дык чатыры пяты ўгору.
        І ў паветры загулялі...
        Няцікавая мінута,
        Бо з сабой яны ня ўзялі
        Ў Галяша хоць парашута!
Так ляцелі можа з добу,
А на землю—зразу ногі,
Як каты... А што—хваробу?
Ня былі-б на тое богі!

## Ч А С Т К А   Д Р У Г А Я

### У ПОЛЬШЧЫ

Аглядзеліся вакола;
„Э! да гэтага-ж мы у Польшчы...
Дзе ў іх добрая стадола?
Хто тут будзе самы большы?“
„Я найбольшы, васпанове!“
Бачаць неякую торбу.—
Едзе верхам на карове
І хвастом гуляе ў корбу...
— „Што ты робіш?“—бог пытае.
Той адказвае: —„Нічога,
Хай хвастом мне не матае—
Пашукае дзе другога!“
Бог зьдзівіўся:—„Хто-ж ты, пане?
— „Быў калісьці, праўда, панам,
А цяпер сяджу ў рыдване
І начую пад парканам“...
Не паняў ні бог, ні Пётра.
— „Чым жывеш ты?—„Сам ня знаю:
Часам выліжу макотра,
Часам хвігу атрымаю!“
Што за сэнс тут—разьбярэце...
„Скуль-жа ты?“—„Адтуль, дапыце,

Дзе я езьдзіў у карэце,
А цяпер—плыву ў карыце!“

— „Так-бы зразу! знаем добра—
Ты з Усходу? Мусіць пану
Добра там далі пад робра,
Што жывеш каля паркану!“

## У ДЭФЭНЗЫВУ

Пан з каровы... „Што за жарты?
Пазнаю вас па размове!
Я ня йграю з вамі ў карты—
Ў дэфэнзыву, васпанове.

І дурны-ж я! Словы со два—
І пазнаць-бы трэ‘ адразу:
Комуністыя абодва—
Ўжо сюды нясуць заразу!

Бо абодва з пят да рыла
Без адзежы і бяз крыжа...
Засьляпіла, злая сіла!
Каб табе на сэрца грыжа!

Лепей позна, чым ніколі...
Ну за мною—товажышэ!
Там на хвост вам ўсыплюць солі—
Задрыжыце вы, як мышы!“

На дваіх—адзін важаты:
Бог з Пятром далі-бы дзёру...
А куды? З чужое хаты
Цяжка бегчы, як на гору.

Трэ‘ ісьці... Бывай, што будзе!
Пан ня кідае карову,
„Бо украднон обцэ людзе“—
І вядзе з сабой размову...

## ПАНСКІ ГОНАР

„Естэм поляк! Мам ойчызнэн!
Вежэн в бога і папежа!
Вшыстко оддам—хоць стажызнэн,
Але не хцэн сёнсьць на ежа!

Ежэм лічэн большэвіка...
Кто то такі?—Окропеньство!
Кажды з ніх ксендзові пстрыка—
На ніц ставі духовеньство!

А цо тычы сен до панув—
Матка боска остробрамска!
Рзнон на пляцы, як баранув...
Яка ж то натура хамска!

У нас вцале так не рачон—
Нех мі сьвядчы вшэхмогонца!
Комунісьці не заплачон—
Мы в ніх палім, як в заёнца!

Пшыклад шукаць недалеко—
Вечоркевіч і Багіньскі:
Не выстыгло ешчэ млеко—
Іх забілі не по сьвінску!

Сам Мурашэк, а не інны!
Элеганскі—з рэвольвэра

Сьлічне пальнол!.. Ешчэ вінны
Сам позостал—по холера!

То розумем... Пшэд коберцэм—
Ешчэ мам до кобет хцівасьць!—
Готув вітаць з цалым сэрцэм,
Бо ту—право і учцівосьць!

О, муй зашчыт! як-то хлопі
Мне роскажон? Нігды в сьвеце!
Лепей дзеці свых утопен,
Леч зостанэн панэм пшэце!

Естэм поляк! Мам ойчызнэн!
Вежен в бога і папежа!
Вшыстко оддам—хоць стажызнэн,
Але не хцэн сёнсьць на ежа!..“

„Што ён блюзьніць?“—бог да Пётры...
„Кінь пытацца нават, божа!
Сам ня бачыш? Гэта-ж лотры,
Што бяз бога жыць ня можа!

А як быў калісьці ў сіле,
Дык людзей лічыў за быдла
І жыўцом гнаіў ў магіле...
Успамінаць і то абрыдла!“

## БОЖЫ ТЛУМАЧ

Бачу—хочаце дзівіцца...
„Ці-ж то Пётр тлумач у бога!
Бо старэйшаму вучыцца
Ня выходзіць ў маладога!..“

Так-то так, а не заўсёды:
Бог з зямлёю знаўся мала—
Толькі можа ў дні пагоды,
Як зязюля кукавала!
Ўвесь-жа час сядзеў заняты,
Як ў вастрозе—век ад малу!
І размова ўся: „Ці ўзяты
Дзьверы раю на завалу?“
Праўда, меў ён раз часінай
Кроплю неякай свабоды,
Але—трэцяю часьцінай
Трыццаць тры з паловай годы...
Што-ж ён мог пачуць і ведаць,
Ня зьбіваючы абсацы?
Колькі раз было—як сьнедаць,
Дык найбольш пякельнай працы...
Бо сьвятыя-ж, як дурныя:
Не падзеляцца бяз сваркі!
Той таму зашыек мые
З-за якой няпоўнай чаркі,
А другі часамі й горай:
Возьме Марту ці Марылю
Сурамятнаю аборай
І вядзе ў лес за мілю!
Або Ной паб'ецца з Хамам,
Ці Савул з Авессаломам,
А Абрам стары—з Адамам,—
Дый ня чым-небудзь, а—ломам!
Трэба ўсюды разабрацца:
Бог адзін, хоць іх і трое!

Як-жа, браце, разарвацца,
Калі ног на трое—двое!

Пётра-ж толькі каля брамы:
Пасачыць—ці на засове,
Спраўдзіць ключ... І з райскай крамы
Пры ў карчму, хоць на карове!

Ну, а там ужо звычайна—
Стрэнеш тога ці другога...
Тут жыцьцё не аднастайна,
Як выходзіць гэта ў бога.

Але што-ж я? Старым чынам
Надта ў бок зайшоў далёка...
Трэ' вярнуцца к тром мужчынам,
Бо зусім прапалі з вока!

Ай, забыўся пра карову—
Галаўнейшую прымету!
Ня відаць рудое з рову?
Каб яны ня зналі сьвету!

З-за сьвятых—хоць сам цымбалю-ж!—
Трэба гнацца болей мілі...
І ня возьме іх паралюш
Або той вансач кабылі!

## УДАГОН

Каля самае Варшавы
Ледзь дагнаў—каб вы прапалі!
Што? Мяне на шклянку кавы
Вы мо' больш і ня чакалі?

Не, я—тут! за вамі сьледам—
Болей кроку не адстану...
Хай палічаць чужаедам—
Сердаваць на іх ня стану,
Бо тут боўдзілы такія,
Што даўно ужо пара вам
Даць заслужанага кія—
З часам гэта будзе правам!
А цяпер—усьлед за богам...
Бог ідзе... Кульгае Пётра...
Бяз прывычкі... басаногам...
А ў пуці—гадзіны со тры!

## У ВАРШАВЕ

У Варшаве мы урэшце...
„Товажышэ! бардзо прошэн!“
І завёў, дзе—хоць зарэжце!—
Адбіраюць ўсё да гроша...
Хто з нас мытніцы ня знае?
Ў Польшчы-ж гэта значыць—ўтрое:
Хто угледзіць,—абмінае,
Каб ня вышла што благое!
„Гдзе ту глувны постэрунэк?“
Пан пытае у шпіёна:
„Мам ойчызьне падарунэк...
Як сен жые панська жона?
Як годуен сен дзятэчкі?
Хвала Пётру, кеды здрові!“
„Каб цябе ўзялі авечкі,
Эх ты, прыхвасьцень карові!“

2072/2

Пётра думаў—бог таксама...
„Ненамылены падліза!“
Усе—ад Эвы і Адама—
„Скуль прышлі, якая віза?“
Стаў пытаць шпіён спачатку...
Лаяў, бэсьціў—твая воля!
Розным вартам лашчыў матку,
Як канюх той у стадоле...
Бог і Пётра згаварыліс
У рот набраць вады і досі:
Глуханемымі зрабіліс...
— „Вы недзьведзе альбо лосе?“
Аж капытам тупнуў Янак...
— „Што маўчыце вы, як дровы?“
Так ён біў я цэлы ранак—
Не дабіўся ані слова!
„Марш, до козы, обормоты!“
Пан—дамоў, усчуўшы пыху—
Толькі пальцы цераз боты
Пазіралі сумна крыху...
І хоць ў панавай галоўцы
Ганаровасьць аж дрыжала—
Усе-ж карова на вяроўцы
Пану мала пасавала!..

## У АСТРОЗЕ

Кепска, браце, у астрозе:
Мала грэе хлеб, як гліна,
Лепш з сякерай на марозе
Ці са збожжам каля млына...

Цемната... Сьмярдзіць параша...
Вартаўнічы ходзіць воўкам...
Лазяць вошы—воля ваша!
Ўровень божым тым кароўкам!
Вось брыда... Карпай макотрам—
Праз гадзіну зноў па вушы...
Вось якія богу з Пётрам
Паднясьлі паны ігрушы!
Гэта быў яшчэ пачатак—
Далей будзе і ня гэтак:
Як пакуштуеш астатак—
Адрачэшся родных дзетак!
Добра толькі, што у бога
Сын вялікі і, як вока,—
Не загіне... Для старога
Невялікая марока!
Ў Пётры ж мо' і былі дзеці,
Але зрэшта—хто іх знае,
Калі сам ён—паглядзеце—
Пра дзяцей не ўспамінае...
„Ты ізноў з дарогі зьбіўся?“
Зараз—мы не на марозе...
Значыць так: застанавіўся
Я з багамі у астрозе...
Вось мы тут і пераспалі.
Кепска... цьвёрда... нудна штосьці...
Але неяксьці усталі,
Хоць і згрызла нас да косьці!
Бог і богу не маліўся—
Холад ўзяў яго за плечы...



Бе 216528
Дзяржаўная
бібліятэка БССР

Каб ты громам запаліўся—
Ня прытулішся да печы!
Каб хоць боты і падковы...
Сабакарня, а ня хата!
З Белавескай пушчы дровы
Мусіць грэюць небагата?..

## АСТРОЖНЫ ЛАД

Так ці гэтак—мыцца трэба,
Хоць з памыйніцы... На ежу
Па шматку далі нам хлеба...
Дай цяпер—насьмерць зарэжу!
Ня з мукі і не з мякіны—
Трэба выбачыць панові!
Гліна, гразь і пілавіны,
А ў дадатак—кал карові!
Ў Пётры з гэтакай прыправы
Стаў кіньдзюк, як тая торба,
Бо ніякай болей справы—
Хоць з гнілой картоплі б сёрба!
Трэ' цярпець... Ня крыкнеш: тата!
Не пачуе жальбу маці...
Ой, праклятая ты крата
У заклятай гэтай хаце!..

## ПАНСКІ ДОПЫТ

Дзень... другі... Вядуць на допыт...
Сьледчы зразу па камандзе:
(Мае! мусіць, даўні вопыт,
Бо служыў у царскай бандзе):

„Стой на месте! В струнку руки!
Чин мой—ваше благородье!
Для какой сюда вы штуки
Шли, жидовское отродье?
Цитадель взорвать хотели?
Что? Неправда? Говорите!
Не пришлось у самой цели
И обидно? Не взыщите!
Бросьте мне играть в молчанку,
А не то—сейчас прикажем
Вынуть лейденскую банку—
Сразу ваш язык развяжем!“
Як сьцяна, маўчаць абое,
Сьледчы лезе проста з скуры:
„Ну, довольно! Что такое?
Не люблю я этой дури!
Гэй, жалнежэ, до помоцы!
В пшэдпокою стоі лава.
Але не! почэкам ноцы—
В ноцы латвей така справа!“

## НАЗАД

Павялі ізноў за краты...
Ой, як гэта няцікава!
Успамінак царскай хаты
У мяне жыве яскрава:
Сам сядзеў у ёй калісьці
Болей году з добрым гакам...
Але трэба далей брысьці
Ўсьлед за богам-небаракам...

Бог сядзіць і ў вус ня дуе...
Пётра-ж ходзіць, як пад хмарай...
І стары над ім жартуе:
— „Што ты—здрэйфіў перад карай?
Бачу—хочаш адрачыся —
Не забыў былога шляху?
Ой, глядзі мая Ядвіся,
Не зрабі чаго ад страху!
Досыць нам тут і „параскі“—
Нос і так направа гнецца...
Не заслужыш гэтым ласкі—
Кожны толькі засьмяецца!
Раз адрокся—тры і будзе!
Трэба мець хоць трохі меру,
А ня божкаць толькі ў грудзі
І маніць, як ксёндз, пра веру...
Дык глядзі-ж, каб не прасіўся—
Я табе, як брату раджу...“
Пётра ўстаў і пабажыўся:
„Далібог, цяпер ня здраджу!“

## ФІГЛІ-МІГЛІ...

Ці за грошы, ці бяз кошту,
Але бачу—зноў зьдзіўленьне...
У чым-жа дзела? А! навошта
Богу гэта прадстаўленьне?
Мусіць коратка вас стрыглі,
Калі вам яшчэ маніцца,
Што бог мог бяз фіглі-міглі
Зразу папрасту адкрыцца...

Так і так, як у завеце:
„Я—ваш бог, а вы—авечкі!“
Мо' паверылі-б? скажэце—
Ой вы, людзі-чалавечкі!
Кожны з вас-бы не паверыў
І сказаў-бы: „Вось шалёны,
Недзе кіем землю мерыў,
А сюды прынёс законы!
Гэта, браце, ня ў пустыні—
Нажыліся пад вуздэчкай!
Дзе пасьлі з табой мы сьвіньні,
Што ты лаешся авечкай?
Ўзяў яшчэ сабе і пару—
Валацуга адурэлы...
Здаўся нам ты на па' вару—
Выбірайся, покі цэлы!
А ня то—дубовай шлягай
Ўсю патыліцу расквашу—
Будзе менш адным брадзягай,
Што ўбіўся ў хату нашу!
Ці-ж няпраўда? Не сказалі-б?
Ой, баюся:—без размовы
Вы-б яму адразу далі,
Каб мы так былі здаровы!
Не сказалі-б вы і самі:
„Літасьцівы, добры, шчэдры!“
І ніколі між багамі
Не паставілі-б ў катэдры...
Гэтак сама-б сеў за краты,
Бяз рукаў далі-б кашулю

І глядзеў-бы з жоўтай хаты
На свабоду, як на дулю!
Але, праўда, у старога
Не адзін быў страх і толькі...
Што вы думаеце—ў бога
Дык і гонару ністолькі?!
Цэлы век каб мецъ прытулак
На сьцяне у кожнай хаце,
Чуць у рот ня клалі булак,
У такой трымалі шаце,
А прышоў—дык не пазналі!
Брыдка стала-б мне самому...
Вось чаму яны маўчалі
І ня скарджыліся нікому...
Я цяпер не вінавайца
За адпраўлены малебен,
Бо пабег у бок па зайца,
Што і вам самым патрэбен...
Значыць, бог Пятру гаворыць:
„Ты адно глядзі—ня кракай!
Трасцу—сьледчы ня уморыць,
Згіне сам яшчэ сабакай!“
Тут пашлі ўжо шэпты ў вуха...
Пра людзей быў толк, ці рэчы—
Не паняў, бо чую глуха
З тэй, пары, як сплю на печы...
Але што? пакуль ня ўбеглі—
Будзем ведаць рэчы тыя...
Бог з Пятром умітусь леглі
І заснулі! як сьвятыя...

## УНАЧЫ

Праз гадзіны тры пацїху
Падышоў жандар пад дзьверы,
Цыркнуў ключ у дзірцы крыху
І—пашлі пісаць паперы!
„Уставайце! сьледчы кліча—
Ў моўчкі йграць ён не дазволіць!
Хутка губы расказлыча,
І пагрэе, і паголіць!“
Вось і ён... Узяўся ў бокі,
Як жарэбчык той падбрыкнуў,
Шкельцы два уставіў у вокі
І вужакай зразу сыкнуў;
„А! Молодчики! поспали?
С аппетитом пили-ели?
Разговорчивее стали?
Иль еще не поумнели?
Все не хочется? Молчите?
Надоели вам глаголы!
Ничего! Заговорите!
Собеседник я веселый!..“

## СЯБРЫ

Раптам дзьверы зарыпелі—
Уляцеў якійсьці новы
І для бога зазьвінелі
Зноў няведамыя словы:
„Як сен маш, колега дрогі?
Цо ту робіш з тон голотон?

Вэзь адразу іх за ногі
І об сьцянэн такон цнотон!
Але зрэшта—хвіля часу:
Кеды не маш пільнэй працы—
Поведзь! кто-то? сконт? не з лясу?
Я цен, слухам, пан Ігнацы!"
—„Овшэм! овшэм! Тэ нечысьці
В тальмудтоже сен учылі,
Потым сталі комунісьці
І до Польскі юш рачылі,
А бы вшчонсьць і ту гармідэр...
Як то муві сен помалу
Под'ёньць галас: „нідэр-міт дэр!"—
Прэч з уціскем капіталу!
І ні слувка пшэ свэ рэйсы!
Отож хцэн, коханы Ежы,
Пукі цо обэрзнонььць пэйсы
І подэгжэць, як належы!"
„Сконт у цябе тэ дробносткі,
Жэ пшэд тобон большевіцы?
Жэ жыдовске маён косткі
І жэ мільчон з таемніцы?"
„—Естэм пшэцеж сын косьцёла!
А кто сьвенты косьцёл слуха,
Не погардза свэго чола—
Тэн ма дар сьвентэго духа!
Я не робен ту наганы,
Не вымысьлям нігды з гловы...
Ото вшыстко, муй коханы...
Роспочынам чын службовы!".

## ЖАНДАРСКІЯ ХОДЫ

„Тэк-с! Сейчас мы вас побреем—
Извините, что без мыла!
И машинкой подогреем,
Чтобы кровь у вас не стыла:

Простудиться здесь недолго,
Да в такой еще одежде!
Ах, забыл спросить-что? Волга
Широка, как была прежде,

При царе, при Николае,
Или стала мелей, уже?
Ну, а как там на Алтае?
Говорите! Ну-же! Ну-же!“

На загад няма адказу—
Як гарох у тую сьцену!
Сьледчы змоўк і пырснуў зразу,
Як з піўной бутэлькі пену...

Клікнуў—варта ў пагатове
За дзьвярмі ужо стаяла,
Каб пры першым толькі слове...
Бо й сама таго чакала...

„Як-жа можна? Вось жыдзюгі!
Для такое, брат, халеры
Электрычнай трэба пугі—
Заравуць, як тыя зьверы!

Калі ў корчы возьме лыткі
І затузае вантробы,—
Усё раскажуць, аж да ніткі...
Утрываць ня мог ніхто-бы!“

## ПАНСКІЯ ЗАБАВЫ

Пачалі з барод і пэйсаў...
Дзьве гадзіны пілавалі
І сьляпы-бы так ня згрэйсаў,
Як яны разьмалявалі!
    Бо кінжал служыў для працы
    І тупы, як брытва ззаду
    У якое-небудзь цацы,
    Што ня знае ў точцы ладу!

Відна пана па халявах!
Так і тут—відаць навука:
Далікатнасьці у справах
Больш часамі і у крука!
    Што казаць? Спытай дзіця ты!
    І малым ад іх прышлося,
    Бо, як тыгра, пан зацяты—
    Дзе яно і завялося?

Вушы вянуць ад іх пыхі,
Бздыраць горш, як тая ведзьма
Проці бабы Карсачыхі...
Але будзе—далей ездзьма!
    Кроў цякла у бога з твару—
    Ён ні разу не заенчыў,
    Нават Пётра вынес кару
    І таксама ня укленчыў!

Мусіць сілу ўзяў авечкі!
Малайчына, калі гэтак...
Каб кабеты—дык бяз спрэчкі
Трэ'-б абоім пекных кветак!

## ПА-АМЭРЫКАНСКУ

Усьлед ідзе другая спроба:
Электрычны ток пусьцілі
Ў ногі, ў рукі, каля лоба
І туды, дзе не галілі...

Страхата глядзець і толькі!
Гэта добрая прыемнасьць;
Калі пойдуць ў целе колькі—
Уся навыварат таемнасьць!

Што і бачыў і ня бачыў,
І ня сьніў ніколі зроду,
Заплявузгаеш наўдачу
Да апошняй кроплі ёду!

Бог круціўся, як вужака:
Папрабуйце хвост прыцісьнуць!
Але ў мове—ані знаку!
Не пазволіў стары пісьнуць.

Пётра віўся кілбасою,
І ў душы хоць бога славіў
Па патыліцы касою,—
Але рота не разявіў!

Дзьве гадзіны... тры... чатыры...
Небаракі ў корчах ўюцца,
Ў галаве мазгі, як гіры—
А на слова не даюцца!

Сьледчы тупае, як ступа!
Зьзелянеў, струпеў ад злосьці,
Аж на ім трашчыць шкарлупа,
У вачох цямнее з млосьці...

Не дабіўся ані гуку!
Толькі лупаюць вачыма
І складаюць ў дулю руку,
Як дзяўчына для айчыма!
Вось праява—не адперці!
„Зьверы з чортавай мярлогі!
Нават болей—самі чэрці!..“
(А ніхто-ж ня скажа—богі!)

ЗА КРАТЫ ЗНОЎ

„Одпровадзіць іх за граты—
Заврацане пружнэ гловы!
Для ніх едно—тылько каты!
Ютра зрана в сонд палёвы!
Росказ круткі і правдзівы...
Негодзяи! до свиданья!
Будьте живы и счастливы—
Завтра... там... в земле...“ Нізваньня,
Ні мур-мур на гэту мову—
Наша пара, як аглохла!
Нават Пётра веран слову—
Мусіць ў лесе ўсё падохла!
Зноў туды, дзе мары... нары...
Дзе за ўсімі сочаць Юды...
Я свае ня кіну пары—
Непадзельна тройца ўсюды!

ВОСЬ ЧАМУ?!

Але што-ж гэта такое?
Разувае Пётр калёшы,

Бог раней таксама тое—
Вось чаму быў прэнт харошы!
    Вось аб чым яны шапталі
    Перад допытам у ночы!
    Як-жа гэта мы праспалі?
    Ці у нас у бельмах вочы?
Хай сабе! Хвалю за розум.
Бог паверыў у навуку,
А ня тым дурным пагрозам,
Што папы нам сунуць ў руку!
    „Скуль сьвятым калёшы ўпалі?"
    Запыталі вы, здаецца,—
    Не анёлы іх прымчалі...
    Э! даўно ужо вядзецца—
Ты—засьнеш, другі вартуе
І украдзе з падпаветкі,
Або проста пажартуе...
Ці-ж вы самі, хлопцы, дзеткі?
    Ў дэфэнзыве вязьняў многа—
    Як зайцоў тых на парошах!
    Болей, праўда, басанога,—
    Але меней і ў калёшах!
Зьбілі толькі з панталыку:
Страціў нітку ад клубочка—
Пачынай ізноў музыку
З тога самага куточка...

## ЯК ТОЙ КАШАЛЬ

Бог аж трэскаўся ад сьмеху...
    „Ці ты, Пётра, трохі бачыў,

Як я дрыгаў на пацеху
І дапытчыкаў калпачыў?!
Капшукі! Каб ім і ў ночы,
І у дзень—нічуць ня шкода—
Не сьвяцілі болей вочы
І ў зямлі была свабода!“
У Пятра паджылкі трэсла
І ужо калола ў лобе:
„Памагло ім гэта крэсла,
Як той кашаль у хваробе!“
Ха-ха-ха! Ён аж качаўся.
І—каб я ня даў папругі,
Дык жывот-бы разарваўся
На шматы з такой натугі.
— „Ну даволі, Пётра, лаяць“,
Бог сказаў і стаў на вуха
Нешта ціха Пётру баяць—
Чую-ж я, вядома, глуха...
Пашаптаўшы не сядзелі:
Заўтра—кату ў рукавіцы!
І са смакам захрапелі,
Як прадаўшы воз пшаніцы...

## ПАН ДУРНЫ, А...

Суд назначан быў ў адрыне.
Спалі ўсе яшчэ ў Варшаве:
Абібокі—на пярыне,
А працоўны люд—на лаве...
Нас да золака збудзілі—
Эх! яшчэ-б... Але нічога:

Пераходка каля мілі
І чакае сьмерць на бога...
Пан дурны, а хітрасьць мае:
Хоць на погляд—салапяка,
Але сьлед свой замятае
Так, як шкодная сабака...
Пераводзіць у сталіцы
Голых вуліцамі брыдка:
Трэба даць хоць нагавіцы
І якую-небудзь сьвітку...
Для Эўропы—знае ўсякі—
Надыходзяць доўгу раты;
Бо самым ім выгляд..
Лепш за ўсё, як кажуць, шаты! —
Каб няпраўда—дык усюды
І ў Парыжы, і у Рыме
Не хваліліся б, паскуды,
Дваццацьпятнымі сваімі!
Крок назад... Далі убраньне,
Хоць з яго ня надта ладу:
Ўсё абдрыпана дазваньня—
Дзіркі сьпераду і ззаду...
Праўда—іншага ня мелі:
На чужой нялёгка ласцы—
Ад нядзелі да нядзелі
У самых няма ні трасцы...
У даўгох сядзяць па вушы,
Больш ніхто на нюх табакі:
Усё на цацкі і кунтушы
Аддаюць бяз сэнсу—флякі!

Мала з мора і да мора—
Дай усё да акіяну!
Эх, браточкі! Колькі гора
Людзі церпяць цераз пана!..

РАЗ... ДВА... ТРЫ...

І паджгалі мы ў адрыну...
Часам зьлева, часам справа
Варта штурхала у сьпіну—
Дысцыпліне іхнай слава!
Стоп... прыехалі... Варота
Зразу насьцеж, як чакалі...
І праз пяць хвілін—басота!
Ужо прыгавар чыталі...
Ня спытаўшыся нічога—
Хто ты? што ты? і чаго ты?—
Ні у Пётры, ні у бога—
Раз... два... тры .. гатовы боты!
Вось абулі, дык абулі!
Ў момант сшылі марынарку:
Ні маргнулі, ні зірнулі—
Ўжо пятля ў цябе на карку!
Мовіць нечага—карона...
Але слухайце вушамі,
Бо судзьдзя сярод амбона
Нешта мыкае губамі!

МУРАЎЁЎСКІ КАЎНЕР

„Час юш скончыць тэн амбарас...
В імен ойца і сьвентэго!

Прошэн встаць: оглошэн зараз
Вырок сонду полёвэго...
Цо? я сына опусьцілэм?
Ніц не значы—бэз галасу!
Справэн велькон выточылэм—
На маленство не мам часу!
Пане ест ту? Нех выходзон,
Бо нектурэ хвіле справы
На жэлондэк ім пошкодзон—
На то вшэльке мам абавы!
Вшыстцы вышлі? Роспачынам:
Леч, кохані мэ панове,
Цо глувнейшэ—то омінам,
Бо фіёлка не мам в глове...
Ото, самі вы відзіце,
Жэ я естэм стражэм права...
У нас вшыстко шло обфіце,
Так, як в паньскім дому—кава!
Лотрытэ, цо ту соньдзімы—
Комунісьці, большэвіцы,
Не кобеты, бо відзімы
На ніх сподне бэз сподніцы!
Вярон жыдзі, як і тшэба:
Наруд тэн вы добжэ знаце!
Правда—часэм кавал хлеба
Самі у ніх вы шарпаце...
Естэм чловек я отварты—
Досконале веце самі:
Ротшыльд... другі... тшэці... чварты
Тэж мянуён сен жыдамі!

Еднак відзэн гмах ружніцы—
Мувёнц крутко, а не веле:
Ту—врагове большэвіцы,
Там—гельдэяжэ збавіцеле!
Мендзы намі... Не... не варто...
Бо не згадноньць, цо кто вружы
І цо мысьлі над тон картон!
Лепей вруцэн до подружы...
Сконт дасталі?—невядомо...
Леч то не гра жаднэй ролі:
Нехай з неба, а нікому
Пшэз то сэрцэ не заболі...
Сьледчы—чловек гоноровы:
Справэн точыл, як належы,
Бо з подэшвы аж до гловы.
В едынэго бога вежы...
Сьвядчы он - нех кажды слуха!
Жэ зараза та холерна—
В імен ойца, сына, духа!
Ест члонкове Комінтэрну...
Зьвёнзэк тэн ма своім цэлем
Згнэнбіць вшысткіх нас, панове!
Ото кшыж пшэд збавіцелем—
Тылько о тым у ніх в глове.
Цо то значы? Мяновіце—
Розрабоваць нас до коньца,
Карміць тылько нас в корыце
І позбавіць навэт слоньца!
Пенкны замяр—сьлічнэ сьродкі!
Не впадаёнц заглэнбоко—

Зьнішчыць вшыстко аж до ёткі,
Цо ні впадне тобе в око!
Ото-ж з мілым тым замярэм —
Тэ—бэзбродэ юш бродачэ
Хцелі пусьціць нас пожарэм...
Зрозумейце, цо то значы!
Але не!—оброны—можэ!
Хвала тобе, мондры пане!
Нех ці пан буг допоможэ
В гною, млеку і сьметане!
Гжэхем лічэн пшэд папежэм —
Крове тэж не зглосіць хвалы:
Нех ці слома бэньдзе пежэм
І пастэжэм—бык зухвалы!
На тым конец... Позостае
Зваруціць до вас, большэвіцы:
Хцелі высьце в нашым краю
Зробіць для нас шыбеніцэ,
Але тэго вам не дожыць!
Ото мэ остатне слова:
Ютро в ноцы ім наложыць
Колнеж пана Муравьёва!
Кленчце, людзэ! О, псяюха!
Сам я кладнэн кшыж на рамен—
В імен ойца, сына, духа
У... папежа! Тэраз—амэн!“

## БОГ, ДЫК БОГ!

Бог—ні слова! Пётр—ні гуку!
Што казаць яму—дурному?

За усю тваю навуку —
Скула матцы і самому!
Падпісаць аб'яву трэба...
Бог грымзоліць паўгадзіны:
„Цар зямлі, вады і неба,
Бог ўсясьветны і адзіны“.
Ніжай бога піша Пётра
Так, як пальцам на рагожы:
І гадзіны пэўна со тры:
„Пётр — апостал, служка божы“...
Ўсе, як ёсьць, хто быў ў вадрыне,
Падышлі і прачыталі,
Пастаялі, як у млыне,
І нічога не сказалі...
„Бог, дык бог! Туды дарога!
Комуністы — не патрэбен!
Каб ня мець такога бога,
Ўсё аддаў-бы на малебен!“
Хоць ты пану ў бруха дышла —
Ня уступіць ані кропкі!
Па-маему праўда вышла —
Эх вы, хлопцы-недатопкі!

## ПАНСКАЯ ХЛУСЬНЯ

Павыводзілі з адрыны...
Бачу—збоку пан карові
Сярод панскае скаціны
Ажно душыцца ў размове...
„Як-то было? вы пытаце...
Овшэм—повем в кільку словах...

Ото-ж так, коханы браце,
З тэго часу, як на кровах
Мы вкрочылі до Варшавы,
Ту і жыён з жонон, з дзецьмі...
І цо мялэм, юш не мецьмі —
То вам мувен бэз обавы!
Стайня... коне... і карэты...
Парк... альтанкі... і півніцы...
Слугі... лёкай... і кобеты
Вшэлькей вагі бяз ружніцы...
Ешчэ тэраз до ніх здольны...
І хоць юш потроху рыпен —
Часэм бывам і свовольны,
Бо о тыле прох не сыпен!
Тэраз мам я: еднон жонэн,
Подобенство якейсь крувкі—
І—не патшонц в вашон стронэн—
Для тэй крувкі—пулвярувкі!
Вшыстко, цо мі позостало...
Навэт буты кашы прошон!
От цо было і цо стало: —
Хлопі мое сяно кошон!
Впрост, выглёндам на словіка,
Цо за гурон нудно седзі
І найвенцей то полыка,
Цо не мувён на споведзі!
За то естэм тутай вольны!
Не паробэк у паробка!
На выборах правоздольны!
І хоць часэм... Але кропка!

Нех ім пан буг за то рачы...
Ото-ж, маёнц слабэ здрове,
З тэй пакуты і роспачы
Я ехалэм венц на крове

І огонкем сен‘ бавілэм...
(Інных забав - не узнае!)
Внэт увагэн свон звруцілэм,
Жэ два голых цось блонкаён...

Я адразу зрозумялэм,
Цо за тацы то особы!
Дочынене з німі мялэм —
В гардле стоён до хоробы!

„Рэнцэ з кешэнь враз до гуры!“
Я—посядам чын вуйсковы!
Оні бегноньць з цалэй скуры.
Але гдзе ту пшэців кровы?

Пшэз тшы крокі полапалэм...
Здравем—не дам сен нікому!
Кровэн з тылу пшывёнзалэм
За свуй пасэк — (зостал в дому)...

Былі то ганебнэ хвіле:
Едэн зьлева, другі справа —
І провадзіць іх тшы міле —
Гдзе Раково, гдзе Варшава?!“

„Чуеш, Пётра?“ Пётра: „чую!“
Бог падумаў: „як і стане?
Каб табе кілу такую —
Колькі ты налгаў тут, пане!“

## ТРЫ ЗАПЫТАНЬНІ

Раптам хлопчык невялічкі,
Што стаяў і слухаў збоку,
Падзіцячы—ня з прывычкі —
Запытаўся тут сароку:

„Я не умем в очу чытаць —
То не в моцы для малэго —
Ото-ж хцял бым пана спытаць:
Сконт кішэне у голэго?

Мое друге запытане,
Яке ма мэншчызна здрове
І чы длуго ходзіць встане,
Кеды езьдзі юш на крове?

Тшэце—в ксёнжцэ я чыталэм:
Пэвне байка бэз розуму!
Нідзе навэт не пыталэм —
Нібы ест зьвежэньце—Пума,

Ў ктурэй глова од огона —
Чтэрэ локце... Огон за то
Ма одлеглосьць цось шалёна
От тэй гловы—дэ квадрато!

Чы то байка тэж у пана,
Жэ Варшава од Ракова
На тшы міле одэрвана?
Бо слышалэм іннон мовэн,

Жэ Раково од Варшавы
Міль дзесёнткі одэрваня!
Боньдзь жэ, пане, так ласкавы
Мі выясьніць тэ пытаня..."

Счырванеў пан, як сабака,
Калі злупяць з яго скуру...
— „Чы відзелісьце лайдака
З под цемнэго тэго муру?
Зэ старшэмі до розмовы
Не втронцайсен ты, галгане!
Бо як вэзьмэн кій хвуевы,
То отшымаш на сьнедане!
Естэсь-мувен ці, босота,
Ешчэ глупі, як тэн тшэвік!
Божэ! відаць, же та цнота
Ютро бэньдзе юш-большэвік...
Зрэшта—ктура то годзіна?
Злоты мялэм... і дывізкэн..
В дому чэка мен родзіна—
Дрога тако-ж не есть блізкон—
Пшэто жэгнам вас, панове!
Мялэм брычкен... До відзэня!
Ой, аж цемно стало в глове
Од такего утрапеня!..“

## ПЕРАД КАРАЙ

Покуль мы тут гаварылі,
Бог і Пётра ўжо заснулі...
Дзе? На нарах, дзе і былі—
Не ў палацы-ж іх запхнулі...
А ці сьнілі што,—ня знаю:
Сны зусім нічым ня меру,
Толькі тое паважаю,
Што ў навуцы мае веру!

Ноч плыве у цёмных хмарах...
Сьпіць Варшава... Дрэмле Прага...
Прытуліўшыся на нарах,
Стогнуць вязьні... Паліць смага.
Таракан зваліўся з печы...
Лямпа дрыгнула ў паветры...
Людзі сьціхлі... Сьціхлі й рэчы...
Цішыня, як там--у нетры!
Толькі часам як-бы грукне
Вартаўнік сваёй прыдачай,
Ці абсац з падковай стукне—
Нават вецер не заплача...
Павярнуўся Пётр і бога
Штурхануў у бок нагою..
Мармытнуў... І больш нічога
За вастрожнаю сьцяною...
Ой, магіла ты, магіла!
Каты... краты... і засовы...
Колькі ты людзей згубіла
З году першага будовы!

### ЛЕПЕЙ КУЛІ

За гадзінай б'юць гадзіны...
Ўжо дванаццаць... Час для працы...
Нешта-ж ціха! Мо радзіны
Ў ката лютага ў палацы?
Але-не! грымяць запоры,
Селядцы брашчаць ў падлогу...
„Пётра, ўстань! Трымай уторы!
Хутка пойдзем у дарогу".

— „Бог і Петр! прошу на сцену.
Я пришел к вам не з задором:
Об'являю вам замену—
Что? довольны приговором?"
—„Каб табе ў грудзёх зарвала!"
Бог падумаў пра сабаку.
„Воля вольная прапала!"
А падзякі—ані знаку...
„Ах! Не нравится? Бароны!
За тюремную б ограду,
На свободу вновь, шпионы,
В благодарность и награду?
Ха-ха-ха! Коротки руки!
Мы еще не очумели,
Чтоб творить такие штуки...
Но довольно! Ближе к цели!
Вам замена, коммунары:
Не хотите—ваша воля—
Вместо вынесенной кары...
Расстреляем среди поля!
Ха-ха-ха! Не ожидали?
Что? Утешил? Легче? Рады?
Все и всех перемолчали,
Коминтерновские гады?"
Адлягло ў душы у бога...
Ой, хутчэй адсюль за краты.
Ў поле чыстае з астрогу,
З замурованае хаты!
Лепей кулі і прыдачы—
Што у полі ні было-бы!

А табе за сьмех сабачы
Хай палопаюць вантробы!

Гэй, шырокае ты поле!
Грушы дзічкі палявыя!
Луг зялёны і раздольле!
Кветкі-траўкі лугавыя!

Ой вы, цёмныя дубравы,
Палявая абгарода,
Лес шумлівы і кудравы—
Ўспомніць—сэрцу асалода!

Звонкі рокат салавейкі
Сьцішыць сумную трывогу...
Эх! няма мае жалейкі—
Засьпяваў-бы сам ў падмогу!..

## НА ПАЛЯНЕ

На паляне, ў лесе цёмным,
Ці ня воўчыя то вочы
Сьвецяць сьветам патаемным
Сярод цішы апаўночы?

Ці ня зьверы на хаўтурах
Смачна ляскаюць зубамі,
Натапырыўшы на скурах
Шэрсьць касматую штыхамі?

Не! здаецца—гэта людзі:
Шэпт зладзейскі—не зьвярыны...
І нацэлены у грудзі
Там камусьці карабіны!

Ці ня Пётры? Ці ня богу?
Ня іначай... Ў дзьве хвіліны
Скончыць вечную дарогу
„Ўсемагутны і адзіны“...

## РАБІН, КСЁНДЗ І ПОП

Але гляньце ў гэты бераг:
Што за трасца? Вось пачвары—
Рабін, ксёндз і поп у шэраг
Сталі ўпобачы ахвяры...
Ой ты, тройца прасьвятая!
Кожны дзержыць дзесянцёры
І па-своему жадае
Выкладаць свае „гіморы“.
„Панбуг не ваш ест, пархатэ!“
„І ня твой, паршывы плеху!“
„Вэк, ір шкоцым! Унзэр татэ!“
Тут было ўжо не да сьмеху...
Поп і рабін за бароды..
З песьні слоў—не выкідайце!
Ксёндз аголены заўсёды—
Дык яго за што?—згадайце...
Паднялі такую сварку,
Што каб трохі было бліжай—
Я наклаў бы ім па карку...
Але вось што было ніжай:
Бог цярпеў, маўчаў і слухаў...
Посьле зразу калі цыкне
На разьюшаных псяюхаў,
Дый на цэлы лес як крыкне:

„Для якое новай згубы
Вы прышлі з-пад цёмнай зоркі?
Вон адгэтуль, душагубы—
Ўсякай нечысьці падпоркі!
Дзе той бог? Няма такога!
Бо, каб быў, дык вас, злачынцы
Ён судзіў-бы болей строга
Вас—ня нас у тэй адрынцы!
Досыць вашага разбою!
Вас прыгнала мусіць, чэрці,
Каб ня даць у супакою
Чалавеку і памерці!..

## РАССТРЭЛ

Зьніклі мары ў чорнай хмары...
Машуць скрыдламі вароны...
Час апошні страшнай кары—
Ў стрэльбах ляснулі патроны...
„Зараз конец члонком банды
Комінтэрну... комунізму...
Прошэн слухаць мэй команды
І по тшэцім—стшал в грудзінэн!
Раз... два... тшы... Фініта... Амэн!
Набуй відаць был шчэнсьлівы...
Карабіны враз на рамен!
Еднак справдзіць—чы не жыві?“
—„Як належы, разстшэлянэ!
Юш не встанон з тэго лона:
Персі чарнэ, крвён залянэ
І, як сіто, зьдзюравёнэ!“

— „Досканале, мое браця!
Чын спэлнілісьце вы скромне:
Пан буг за то вам заплаці
І ойчызна не запомні!“
„Ешчэ хцял бым спытаць власьне,
Як жэ з дулем?“ — „Ані хвількі—
Нех іх пёрун ясны тшасьне!
Падло тэ пагжэбён вількі“...

# Ч А С Т К А  Т Р Э Ц Я Я

## СЬПЯЦЬ ПАКАРАНЫЯ

Водгук тупату і гукаў
У немай далі мерна згінуў...
Стала ціха. Толькі тукаў
Недзе дзяцел ў дамавіну...
    Ў небе нібы ненарокам
    Выплыў месячык з-за хмары
    І пахмурым глянуў вокам
    На крывавыя ахвяры...
Пасярод лагчыны пністай
Ў агарожы елахвойнай,
На траве зялёна мшыстай
Бог і Пётра сьпяць спакойна...
    Сьпяць пакараныя людзі
    І залітыя крывёю;
    Чырванеюцца іх грудзі
    У бязьлюдным супакою!
Але—цыц! паміж кустамі
Нехта йдзе нячутным крокам
І паглядае часамі
Ў цемнату бліскучым вокам...
    Ўсё мацней трашчаць галінкі
    Нецярэбленае гушчы...

Ці ня воўкі на памінкі
Падыходзяць з цёмнай пушчы,—
Каб з усёй зьвярынай сілы,
Надрываючы вэнтробы
Скавытаць каля магілы
Песьню воўчае жалобы?

Стойце... ціха... Мо здаецца
Мне са страху ці праўдзіва,—
Як-бы нехта ўжо сьмяецца
У паўголас—палахліва?

Не, напраўду! У пустэчы
Чалавечы чуцён рогат
І у тон, пачалавечы,
Аддаецца воўчы скогат...

## НЯ БЫЛО ТУТ ЦУДА

Покуль бег я—разьвіднела...
Бачу ясна, хоць здалёку,
Але гэтакае дзела,
Што ня даў-бы веры воку.

Каб хоць трошкі ў цуды верыў
І ня гэтулькі па сьвеце
Розных сьцежак перамерыў!
Толькі самі паглядзеце:—

Бог і Пётра посьле казьні,
Сеўшы верхам на калодзе,
Лушчаць вошай, як у лазьні,
І сьмяюцца на свабодзе...

„Ха-ха-ха! не дачакалі
Чужаеды нашай згубы,
Каб над намі балявалі
Губы воўчыя і зубы!
Ха-ха-ха! ў вачох у ката
Мусіць бляск стаяў чырвоны
Ад штандараў, што багата
Ўзьнялі ужо мільёны!
Ха-ха-ха! Усюды здрада...
Ні вастрог, ні бог крывавы
Ўратаваць ня могуць гада
Ад крывавае расправы!“
„Значыць—іх не расстралялі?
Як-жа гэта вышла, браце?“
Лепш-бы, хлопцы вы маўчалі:
У старой замшэлай хаце
Нават сьцены вушы маюць!
Мо і тутака шпіёны,
Як усюды, пазіраюць
Праз трухлявыя бярвёны?
Трохі бліжай сесьці трэба
Бог і Пётра сьведчаць самі—
Ня было тут цуда з неба!
Чуйце ўласнымі вушамі.
Мудрагеліць трэ‘ нямнога:
Хай другія з цэлай скуры
Аж крычаць: усё—ад бога!
Я скажу ім: не—з натуры!
Ня усе у Польшы каты,
Што у вопратцы жаўнера,

І ня ўсіх яшчэ за краты
Завялі паны, як зьверы!

Ёсьць крыху яшчэ і дома...
Вось усе мае вам словы:
Рэшта ўся цяпер вядома
Без далёкае размовы...

Трэ' ісьці на помач богу,
Бо баюся, што часамі
Ён, ня знаючы дарогу,
Можа стрэнуцца з панамі.

А тады—усё прапала,
Бо і тым нядобра будзе,
Што стралялі, як папала,
Толькі так, каб ня у грудзі!

## ГОДЗЕ СЬВЕЧКІ ТЫКАЦЬ...

Сярод лесу у крыніцы,
Што бурчэла між травою,
Бог і Пётра нагавіцы
Мыюць чыстаю жарствою...

Посьле вымыліся самі
І на сонейку абсохлі...
Ой, як добра не з панамі—
Каб яны усе падохлі.

„Ну, Пятрок, куды падацца,
Каб ні хвілі, і ніколі
Ўжо з багатымі ня знацца
Ні у хаце, ні на полі?

У якой ляжыць старонцы
Край надзеі і свабоды
І растуць-цьвітуць на сонцы
Кветкі Працы—асалоды?

Ці ня ўсходнія абшары,
Дзе закінуты аблогам
Дзьве трацiны у папары,
І дзе людзі басаногам?

Але дзе ідзе навука
Новым шляхам, без разбою,
І з усім старым разлука,
Нават з богам і з табою.

Хваціць! Годзе сьвечкі тыкаць
Мне пад самы нос, як дулю,
І у вочы дымам пыкаць,
Ўзьдзеўшы рызу ці кашулю!

Мне здавала—у Польшчы рай мо?
А папалі у ваброць мы...
Не чакайма-ж! Уцякайма
Ад паноў, ксяндзоў і процьмы...

## ЧАСТКА ЧАЦЬВЕРТАЯ

### ЗА КУЛЮ—ДУЛЮ

Зьвечарэла... Над зямлёю,
Як дзяругі, віснуць хмары...
І глухою сьцяжыною
Бог і Пётра йдуць у пары ..
Маўчаком, бо каля межы
Пастка ўсякаму гатова—
Кожны закутак мядзьвежы
Зловіць шэпнутае слова...
Ў лесе цемра—хоць ты вока!
Толькі обмацак і ногі
Пакіруюць, каб далёка
Ня сысьці з свае дарогі...
Усё бліжэй і бліжай мэта...
Раптам блiснула у цемры—
Ці ня панская ракета
Разарвалася ў паветры?
Стой за дрэвам... ані кроку...
Бо у пабліжы залога—
Атрымаеш кулю з боку!
Хай уцішыцца трывога...
Бог і Пётра пачакалі,
Покуль сьціхла і пагасла...

Ад мяжы яны стаялі
Не далей, як цераз прасла...

А цяпер—гайда з мярлогі
Так, як заяц з крутасклону—
Гоп! на ўсе чатыры ногі
Праз заказаную зону!

Трах-тах-тах... за куляй кулю—
Міма Сідара у сьцену!
І паном за кулю—дулю
Слала рэха у адмену...

ГОРШ НЯ БУДЗЕ

Каля самага праходу,
Як-бы зналі і чакалі,
Толькі з лесу—ані ходу:
Бога з Пётрам затрымалі...

„Хто вы? Скуль?" Няма адказу...
— „Няўжо і тут нанова
Нас палічаць за заразу,
Калі мы ня скажам слова?"

Болей голасна пытаюць:
„Мо' вы глухі, або немы?"
І аж плечы пацікаюць,
Бо ізноў ніякай „бэ-мы"...

Што рабіць? Чужыя грудзі,
Як у ночы тая глеба—
Хоць зусім, як людзі, людзі—
Ў ГПУ адправіць трэба...

Бог ідзе сабе ў размове:
„Горш ня будзе, як у пана,
Што гарцуе на карове
І начуе ля паркану“...

Пётра-ж—не! Як на патэльні:
— „Панясло нас на пакуту,
Як з якой-нібудзь цагельні
У шкляную тую гуту!

І чаго сюды нас пёрла?
Звадыяш стары—і толькі!
Каб табе смалы у горла —
Мо‘-б язык ня лопаў столькі!“

## У ПАДВАЛЕ

Так ці гэтак—у падвале...
Але дзе тут тая кара:
Каб ня дзьверы на завале,
Жыў-бы лепш за камісара!

Гавару вам, як прад небам!
Я—дальбог—ня комуністы,
Але хлеб тут пахне хлебам,
Смак—ня так, затое—чысты...

З аржаной мукі... Заквашан
Не ў памыйніцы, а дзежцы...
Значыць—чорт ня гэтак страшан,
Як малююць ўсе драпежцы!

Сьцены выбелены бела,
Добра вымыта падлога:

Хоць і голай сядзеш—сьмела!
Не запэцкаеш нічога...
Колькі хочаш каля кранту
Лі ваду—бяз ўсякай шкоды:
Не знайсьці другому франту,
І ў бацькоў такой выгоды!
Двор, як стол,—напроці ганку:
Крок адзін з тае сьпіжарні —
Зразу маеш пагулянку
Так, як конь у малатарні!
Выйсьці трэ'—ідзе важаты,
Што спытаешся—раскажа,
Давядзе назад дахаты,
Нават закутак пакажа...
Не пакрыўдзіць ў кепскім слове!
Хоць і тут шануюць матку:
Бо часамі у размове
Матку ставяць на пачатку...
Пётра ўраз, як конь разорай!
Кінуў лаяць на старога
І пачуў сябе ня горай, —
Як за пазухай у бога.
І хоць ў полудзень нікому
Не падалі марцыпанаў,
Але ўсякі еў, як з дому —
Бяз прусоў і тараканаў..
Посьле панскага астрогу —
Хто ня верыць, хай пазнае!
Тут быў рай Пятру і богу:
Чалавек адпачывае!

Аднаго бракуе—сьвету:
Бо ваконца у дзьве цалі...
Рады мала: хату гэту
Не на гэта будавалі...

Гэтак сама і у нарах
На развод крыху брыдоты..
Было-б дзіва, каб па шпарах
Не вялося ані ёты!

Але што? ці-ж гэта вошы?
Як той мак-відук часамі!
Хоць на выстаўку за грошы:
Толькі назва, а ня самі...

Але будзе ва ўсе косьці
Размалёўваць на ўсе бокі,
Бо самога клікнуць ў госьці—
Шлях астаўся недалёкі...

## АПРАЎДАЛІ

Каб хутчэй пачаць канчатак,
Бо і так я доўга бразгаў,
Што зрабілась на астатак —
Раскажу без падрабязгаў...

Як на добрым сенавале,
Посьле добрае дарогі,
Бог і Пётра пераспалі
Бяз усякае трывогі...

Ў поўдзень сьледчы іх паклікаў,
Распытаў пачалавечы

І ні разу не засыкаў
Так, як той пастух авечы...
Бог і Пётра не маўчалі:
Ня было чаго таіцца,
Калі людзі перасталі
І бяз гэтага маліцца...
Не патрэбны і драбіны —
Як па маслу ці па здору
Праз якое паўгадзіны
Праўда вылезла на гору...
Каб Эўропа не казала,
Што у нас няма закону,
Справа доўга не ляжала
І пабегла без разгону...
Перад цэлым белым сьветам
У Вышэйшым трыбунале,
Дзе быў доступ і кабетам,
Бога з Пётрам—апраўдалі...
„Бо няма такіх на сьвеце
І не здаралася ніколі!
А табе за іх, поэце,
Трэба так усыпаць солі,
Каб якіх чатыры годы
Ад крыніцы да крыніцы
Бегаў піць—і назаўсёды
Кінуў слухаць нябыліцы!“

Ліпень, 1925 г.

[illegible]
[illegible]

# ЗЬМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Ад аўтара | 3 |
| Прадмова | 5 |
| **ЧАСТКА I-я** | |
| У раі | 7 |
| У карчме | — |
| Шкандал | 8 |
| Хамская расправа | 9 |
| З неба на зямлю | — |
| **ЧАСТКА 2-я** | |
| У Польшчы | 11 |
| У дэфэнзыву | 12 |
| Панскі гонар | 13 |
| Божы тлумач | 14 |
| Удагон | 16 |
| У Варшаве | 17 |
| У астрозе | 18 |
| Астрожны лад | 20 |
| Панскі допыт | — |
| Назад | 21 |
| Фіглі-міглі | 22 |
| Уначы | 25 |
| Сябры | — |



бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

| | Стар. |
|---|---|
| Жандарскія ходы | 27 |
| Панскія забавы | 28 |
| Па-амэрыканску | 29 |
| За краты зноў | 30 |
| Вось чаму | — |
| Як той кашаль | 31 |
| Пан дурны, а... | 32 |
| Раз.. два... тры... | 34 |
| Мураўёўскі каўнер | — |
| Бог, дык бог | 37 |
| Панская хлусьня | 38 |
| Тры запытаньні | 41 |
| Перад карай | 42 |
| Лепей кулі | 43 |
| На паляне | 45 |
| Рабін, ксёндз і поп | 46 |
| Расстрэл | 47 |

ЧАСТКА 3-я

| | |
|---|---|
| Сьпяць пакараныя | 49 |
| Ня было тут цуда | 50 |
| Годзе сьвечкі тыкаць... | 52 |

ЧАСТКА 4-я

| | |
|---|---|
| За кулю—дулю | 54 |
| Горш ня будзе | 55 |
| У падвале | 56 |
| Апраўдалі | 58 |

**БІБЛІОТЭКА БЯЗБОЖНІКА**

**ВЫШЛІ З ДРУКУ:**

ДЗЬМІТРЫЕВА

ЦЕМРА і ЗАБАБОНЫ

В. САРОКІН

ПРА НАРАДЖЭНЬНЕ БАГОЎ

КАМСАМОЛ НА ФРОНЦЕ БЯЗБОЖЖА

КАЛЯДЫ НА СЛУЖБЕ Ў ЭКСПЛЁАТАТАРАЎ

АЛ. СЬВЯТЛОЎ

РАБСЕЛЬКОРЫ СУПРОЦЬ ПАПОЎСТВА і РЭЛІГІІ

М. ГОРАЎ

СЬВЯТЫЯ ЎГОДНІКІ

МАТУЛАЙЦІС

ХРЫСТОС і ВЯЛІКДЗЕНЬ

30к.

~~Цена 35 коп.~~

378

Бел. аддзел
1994 г. 1

B000000004033802